# «Залатыя пункты» сталіцы

### НАРЫС

***Паважаная рэдакцыя! Нядаўна прачытаў у вашым часопісе фотазамалёўку Э. Астаф'ева «Італія — вачамі скульптара». Што ж, Італія — краіна цікавая. Невыпадкова яе сусветна вядомыя помнікі культуры вабяць турыстаў і прыхільнікаў класічнага дойлідства.***

***Прачытаўшы замалёўку, я падумаў: а што мы ведаем пра тыя мясціны, дзе жывём і працуем? Пэўна ж, і ў нас ёсць нямала такога, што можна паказаць і пра што можна расказаць? Я па прафесіі — будаўнік. На працягу многіх гадоў узводзіў у Мінску будынкі прамысловага і культурнага прызначэння і быў задаволены сваёй працай. Але зараз, калі цяжкая хвароба прыкавала мяне да ложка, не-не ды і з'явіцца прыкрая думка, што вельмі мала ведаю пра тое, калі, як і кім ствараліся будаўнічыя аб'екты, якія займаюць прыкметнае месца ў архітэктурным абліччы нашай сталіцы.***

***Прашу вас, калі ёсць такая магчымасць, раскажыце на старонках часопіса пра тое, як складваўся той Мінск, які людзі бачаць сёння, як з'явіліся, ну, скажам, тэатр оперы і балета, плошча Перамогі, тэатр аперэты, Дзяржаўная бібліятэка — былая «Ленінка». Мне здаецца, расказ пра гэтыя, а можа, і якія іншыя прыкметныя будынкі будзе цікавы не толькі для мяне, але і для іншых чытачоў.***

***Ул. Мядзведзеў,***
***інвалід 1-й групы.***

АД РЭДАКЦЫІ: Мы паказалі ліст нашага чытача архітэктару Барысу Мікалаевічу Назаранку, усё творчае жыццё якога звязана з Беларуссю — у складзе групы архітэктараў ён працаваў над генеральным планам забудовы Заводскага раёна Мінска, удзельнічаў у стварэнні архітэктурных праектаў у Брэсце, Бабруйску, Віцебску, Магілёве, Полацку, быў у свой час намеснікам галоўнага архітэктара сталіцы.

Вось што ён расказаў.

І мінчане, і госці горада бачаць Мінск, пабудаваны ў асноўным пасля вайны. Людзі старэйшага пакалення памятаюць горы каменнага друзу, перакручаныя агнём жалезныя бэлькі і арматуру, абгарэлыя, разбураныя сцены дамоў, чырвоны цагляны пыл, які вецер узнімаў над цэнтрам, і пусткі з комінамі на месцы кварталаў, дзе раней стаялі драўляныя дамы.

Сярод гэтага папялішча сям-там узвышаліся некалькі збудаванняў, што выпадкова ўцалелі ў агні ваеннага ліхалецця, напамінаючы аб першых кроках па пераўтварэнню былога, як кажуць, заштатнага горада ў сталіцу рэспублікі.

Відаць, ёсць у іх нешта такое, што нават сёння, калі карэнным чынам змянілася аблічча горада, калі ў цэнтры і на ўскраінах з'явілася мноства прыгожых арыгінальных збудаванняў і архітэктурных ансамбляў, яны не згубіліся і выклікаюць цікавасць, пра што сведчыць і ліст вашага чытача Ул. Мядзведзева.

Мне, чалавеку пажылому, зразумела такая цікавасць — гісторыя заўсёды так або інакш звязана з сённяшнім часам, і той, хто не ведае мінулае, не можа па-сапраўднаму разумець і сучаснасць.

А пачаць я хацеў бы (думаю, што чытачы зразумеюць мяне) з плошчы Перамогі. Яна — сімвал Мінска, вядомы далёка за межамі нашай рэспублікі, бадай, адно з самых прыгожых месц сталіцы.

Мне не раз даводзілася чуць ад людзей, якія ўпершыню бачылі плошчу, што ім здаецца, нібыта яна існуе столькі ж, колькі існуе сам горад. Ну, вядома, дадавалі

яны, калісьці плошча мела зусім іншую, чым зараз, забудову, але яна была на гэтым месцы, і была такая ж круглая. Проста яе не магло не быць!..

Мне знаёма такое ўражанне: яно ўзнікае там, дзе пануюць суладнасць, гарманічнае спалучэнне асобных частак, якія зліваюцца ў цэлае — адзінае па задуме і выкананню.

Аднак той, хто памятае даваенны Мінск, скажа, што тут ніякай плошчы тады не было і знаку, а было звычайнае скрыжаванне, якіх у вялікім горадзе не адна сотня.

На жаль, я не ведаю, хто першы звярнуў увагу на гэтае скрыжаванне і зразумеў, што менавіта тут знаходзіцца тое, што на мове архітэктараў называецца «залатым пунктам», гэта значыць, самае выгаднае, самае зручнае месца, якое пасля пэўнай забудовы можа стаць сапраўдным упрыгожаннем горада: наперадзе парк, рэчка, а за ёй на ўзгорку — панарама цэнтра. Магу толькі сказаць, што знайсці, убачыць такое месца сярод адна-двухпавярховых кварталаў ускраіны былога губернскага горада мог не кожны, на гэта патрэбен вялікі талент.

І ў 1939 годзе каля таго самага скрыжавання былі закладзены падмуркі двух паўкруглых будынкаў, якія быццам дзве далоні накіроўвалі галоўную вуліцу да рэчкі і далей — у цэнтр.

Заканчваць іх будаўніцтва давялося пасля вайны. Потым былі пабудаваны дамы з двух бакоў праспекта. Так у выніку работы архітэктара Ю. Кілаватава і кансультанта В. Вітмана ўзнік архітэктурна-планіровачны ансамбль — Круглая плошча, невялікая, утульная, з якой адкрываўся прыгожы краявід.

Калі ж было вырашана пабудаваць помнік у гонар перамогі над фашысцкай Германіяй, то як бы сама сабою склалася агульная думка: стаяць ён павінен якраз на гэтай плошчы — колькі ні шукай, а лепшага месца ва ўсім горадзе не знайсці.

З таго моманту, як быў узведзены помнік Перамогі, плошча змянілася не толькі знешне: набыла ўрачысты выгляд, стала яшчэ больш прыгожай — змянілася значэнне, месца, якое займае яна ў жыцці горада, і не толькі ў святочныя дні.

Як хвалі часу абцякаюць помнік патокі людзей на тратуарах, транспартныя патокі, а ён стаіць і будзе стаяць нязменным і вечным сімвалам Перамогі, несучы ў будучыню нашу памяць аб барацьбе за свабоду і незалежнасць.

Лічыць Траецкую гару сапраўднай гарой можна толькі, як кажуць, з вялікай нацяжкай. Аднак у раўнінным горадзе яна, як любое іншае больш-менш прыкметнае ўзвышша, і ёсць яшчэ адзін «залаты пункт», што самой прыродай «прызначаны» для размяшчэння якога-небудзь неардынарнага збудавання. Прыўзнятае над наваколлем, віднае здалёк, яно абавязкова будзе прыцягваць да сябе ўвагу.

Вось для гэтага вельмі выйгрышнага месца ў майстэрні вядомага архітэктара І. Лангбарда быў створаны праект Вялікага акадэмічнага тэатра оперы і балета. Пастаўлены на высокі цокаль трох'ярусны гмах з каланадай і шырокімі параднымі лесвіцамі выглядаў прывабна і ўрачыста.

Два гады на плошчы Парыжскай Камуны будавалі тэатр. У 1937 годзе ён быў адкрыты.

Праўда, узведзены будынак крыху адрозніваўся ад першапачатковага праекта. Эканомячы сродкі, сёе-тое зрабілі ў спрошчаным варыянце, што не магло не адбіцца і на вонкавым выглядзе тэатра. Манументальны, добра выглядаючы здалёк, ён нямала губляў пры аглядзе зблізку.

У час вайны будынак тэатра ўцалеў, можна сказаць, выпадкова — буйнакалiберная бомба, што трапіла ў яго, не ўзарвалася. Акупанты зрабілі тут вялікую стайню для армейскіх коней, размясцілі розныя склады, так што пасля вызвалення Мінска давялося ўкласці шмат сіл і сродкаў, каб вярнуць тэатру яго ранейшы выгляд.

А потым пад кіраўніцтвам аўтара праекта была праведзена рэканструкцыя будынка тэатра, і цяпер ён вянчае Траецкую гару амаль такі ж, якім быў задуманы каля шасці дзесяткаў гадоў назад.

У 1932 годзе ў асноўным была закончана забудова Чырвонаармейскай вуліцы — быў завершаны адзін з этапаў абнаўлення горада.

Высокі правы бераг Свіслачы з пункту гледжання архітэктуры з'яўляўся вельмі цікавым месцам. Тут як бы праходзіў край цэнтральнай часткі горада і вельмі прыдаўся б ансамбль, які нейкім чынам адзначыў бы гэтую прыродную мяжу.

У той жа час збудаванні, узведзеныя па краі ўзвышша, маглі вельмі ўзбагаціць, упрыгожыць гарадскі пейзаж, бачны з зарэчнай часткі.

Вось з такой задумай былі створаны праекты двух гмахаў, узведзеных па Чырвонаармейскай,— як іх тады называлі, акругавага Дома Чырвонай Арміі і Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна.